ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 38 (559) | Субота, 24 снежня 1983 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

У мінулую нядзелю сродкі масавай інфармацыі краіны апавясцілі савецкіх людзей аб назначэнні чарговых выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Яны адбудуцца 4 сакавіка 1984 года. У гэты дзень мы аддадзім свае галасы за самых дастойных, надзеленых высокім давер'ем сыноў і дачок сацыялістычнай Радзімы.

Выбары ў вышэйшы кіруючы орган Савецкай дзяржавы — буйнейшая палітычная падзея ў яе жыцці. Яны маюць вялікае значэнне для далейшага развіцця сацыялістычнай дэмакратыі, для дзейнасці ўсіх Саветаў. У час перадвыбарнай кампаніі работа павінна весціся пад знакам барацьбы за ўздым ініцыятывы мас, разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва, умацавання працоўнай дысцыпліны.

Формы перадвыбарнай работы разнастайныя і іх трэба прадумана і ўмела выкарыстоўваць. Гэтага патрабуе ў сваёй пастанове Цэнтральны Камітэт КПСС, які разгледзеў задачы партыйных арганізацый у сувязі з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў у Вярхоўны Савет СССР адзінаццатага склікання. Адно з галоўных патрабаванняў — глыбокае растлумачэнне плённай дзейнасці КПСС па ўзмацненню эканамічнай і абароннай магутнасці краіны, забеспячэнню росту дабрабыту народа, замацаваных у Канстытуцыі СССР гістарычных дасягненняў развітога сацыялізму, прынцыпаў сацыялістычнай дэмакратыі: выхаванне працоўных у духу дружбы народаў СССР, савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, пастаяннай гатоўнасці стаць на абарону заваёў сацыялізму.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі патрабуе таксама шырока прапагандаваць знешнюю палітыку Савецкага Саюза, яго дзейнасць па ўмацаванню сусветнай сацыялістычнай садружнасці, захаванне і ўмацаванне міру: актыўна выкрываць рэакцыйную, антынародную сутнасць імперыялізму, злавесныя мілітарысцкія планы ЗША і НАТО, выхоўваць класавы падыход да падзей міжнароднага жыцця, высокую пільнасць; даваць рашучы адпор падрыўной імперыялістычнай прапагандзе, аргументавана крытыкаваць ілжывую буржуазную дэмакратыю.

У перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Савет СССР высокай актыўнасцю павінны вызначыцца камуністы, усе работнікі ідэалагічнага фронту нашага універсітэта. Многія выкладчыкі і супрацоўнікі ўваљюцца ў рады агітатараў. Жывым, праўдзівым словам яны абавязаны захапляць выбаршчыкаў, дабіцца таго, каб агітпункты сталі сапраўднымі цэнтрамі прапагандысцкай работы.

У гэты адказны час прыбавіцца спраў у членаў універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды». Ад іх чакаюць змястоўных лекцый, цікавых гутарак у працоўных калектывах.

Ва універсітэце, на факультэтах, у інтэрнатах неабходна праводзіць сустрэчы з народнымі дэпутатамі Саветаў, вечары пытанняў і адказаў, дні адкрытага пісьма і многія іншыя тэматычныя мерапрыемствы.

Перадвыбарны перыяд адметны і ў жыцці студэнтаў. Хутка яны будуць здаваць залікова - экзаменацыйную сесію. Добрыя і выдатныя адзнакі, атрыманыя на ёй, стануць дастойным падарункам знамянальнай падзеі ў гісторыі Краіны Саветаў.

**І. НЯМКЕВІЧ,**
**намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце.**

# Сесія Вярхоўнага Савета БССР

Клопатамі аб савецкім чалавеку, аб яго дабрабыце была прасякнута работа восьмай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзесятага склікання, якая адбылася 22 снежня ў Мінску.

...Дзесяць гадзін раніцы. За сталом старшыні І. П. Шамякін — Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, В. П. Булава, П. Т. Дземчанка, Я. П. Паўлючэнка, І. І. Плаўскі — намеснікі Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Ва ўрадавых ложах — таварышы М. М. Слюнькоў, І. Я. Палякоў, У. І. Бровікаў, Г. Г. Барташэвіч, В. Г. Балуеў, М. І. Дземянцей, М. В. Кавалёў, Ю. Б. Колакалаў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. А. Ляпёшкін, Ю. М. Хусаінаў, І. Ф. Якушаў, У. Е. Лабанок, Н. Л. Сняжкова, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Г. З. Лапанік, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. П. Чагіна, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, члены ўрада рэспублікі.

Старшынствуючы — дэпутат І. П. Шамякін аб'яўляе восьмую сесію Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адкрытай. Ён паведамляе, што на разгляд Вярхоўнага Савета Беларускай ССР уносяцца наступныя пытанні:

1. Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб назначэнні У. І. Бровікава Старшынёй Савета Міністраў Беларускай ССР.
2. Аб праекце Жыллёвага кодэкса Беларускай ССР.
3. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Вярхоўны Савет аднагалосна ўключыў названыя пытанні ў парадак дня сесіі.

Слова па першаму пытанню мае першы сакратар ЦК КПБ дэпутат М. М. Слюнькоў.

— Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, — гаворыць ён, — рэкамендаваў Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР і рэкамендуе цяперашняй сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі назначыць У. І. Бровікава Старшынёй Савета Міністраў БССР. Мы ўпэўнены ў тым, што таварыш У. І. Бровікаў дастойна будзе выконваць гэтыя высокія абавязкі.

Вярхоўны Савет аднагалосна прымае пастанову аб назначэнні У. І. Бровікава Старшынёй Савета Міністраў БССР і зацвярджэнні адпаведнага Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. У сувязі з гэтым Вярхоўны Савет вызваліў У. І. Бровікава ад абавязкаў члена Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Слова па другому пытанню — аб праекце Жыллёвага кодэкса Беларускай ССР — атрымлівае старшыня камісіі па камунальнай гаспадарцы, добраўпарадкаванню і дарожнаму будаўніцтву Вярхоўнага Савета БССР дэпутат А. А. Якімчук.

Затым пачалося абмеркаванне праекта Жыллёвага кодэкса Беларускай ССР.

Пасля перапынку працягвалася абмеркаванне праекта Жыллёвага кодэкса БССР.

Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў Жыллёвы кодэкс Беларускай ССР і пастанову Вярхоўнага Савета БССР аб увядзенні яго ў дзеянне.

З дакладам па трэцяму пытанню парадку дня выступіла сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР дэпутат Л. П. Чагіна. Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў законы і пастановы аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, прынятых пасля сёмай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзесятага склікання.

Разгледжаны прапановы, адобраныя Саветам старэйшын Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, аб унясенні некаторых змяненняў у составы пастаянных камісій Вярхоўнага Савета рэспублікі.

(БЕЛТА).

## У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта разгледжана пытанне аб стане падрыхтоўкі спецыялістаў па завочнай форме навучання. Выступілі дэкан завочнага факультэта дацэнт А. В. Саннікава, яе намеснік дацэнт А. П. Смоліна, член парткома, загадчык кафедры навуковага камунізму У. І. Качаткоў, сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

У дакладзе і выказаных на пасяджэнні парткома меркаваннях адзначана, што за апошнія гады на завочным факультэце якасна палепшана падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці. Адначасова ўказана на некаторыя меўшыя месца недахопы.

У прынятай пастанове завочнаму факультэту рэкамендавана расшырыць колькасць індывідуальных заданняў для студэнтаў пры выкананні імі кантрольных і курсавых работ. Дэканат і выпускаючыя кафедры абавязаны ўзмацніць сувязь з прадпрыемствамі і арганізацыямі.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

У сераду ў актавай зале ГДУ адбылося пленарнае пасяджэнне X студэнцкай канферэнцыі па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага рабочага руху. Канферэнцыя падвяла вынікі унутрывузаўскага этапа агляду-конкурсу, які пачаўся год назад. Практычна ўсе студэнты дзённага аддзялення ў той ці іншай форме прынялі ўдзел у гэтым этапе конкурсу. Найбольш распаўсюджанай былі рэферацыйная і дакладная формы.

Прайшоўшы перыяд быў багатым на падзеі гістарычнай важнасці. Гэта 60-годдзе ўтварэння СССР, 165-годдзе з дня нараджэння К. Маркса, 80-годдзе ўтварэння РСДРП, 40-годдзе вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Усе яны знайшлі адлюстраванне ў тэматыцы рэфератаў, курсавых канферэнцый, якія праводзілі кафедры грамадскіх навук. Лепшыя з іх увайшлі ў праграму X студэнцкай канферэнцыі.

Канферэнцыю адкрыў прарэктар па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель. З цікавымі дакладамі выступілі студэнты А. Шчома, І. Эсмантовіч (гісторыка-філалагічны факультэт), Г. Мамачкіна, І. Есафаў, Л. Белая (эканамічны факультэт), Ю. Кіракоў (геафак).



НА ЗДЫМКУ: з прадстаўленымі на выстаўцы студэнцкімі работамі знаёмяцца ўдзельнікі канферэнцыі.

Фота А. Карніенкі.

У фае актавай залы была адкрыта выстаўка з матэрыяламі падрыхтоўкі кафедр да X агляду-конкурсу студэнцкіх работ. Яна выклікала вялікую цікавасць удзельнікаў канферэнцыі.

У той жа дзень адбыліся пасяджэнні секцый па ўсіх кафедрах грамадскіх навук. Лепшыя даклады рэкамендаваліся аргкамітэтам ГДУ на абласны тур агляду-конкурсу, які адбыўся 20 снежня на базе Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту.

**Г. ВЕТЛУГАЕЎ,**
**старшыня аргкамітэта ГДУ, дацэнт кафедры палітэканоміі.**

## РАСКАЗАЎ УДЗЕЛЬНІК КАНГРЭСА

На гэтым тыдні на матэматычным факультэце адбылася сустрэча студэнтаў, якія спецыялізуюцца па алгебры, многіх іншых будучых матэматыкаў з удзельнікам міжнароднага матэматычнага кангрэса ў г. Варшаве прарэктарам па вучэбнай рабоце універсітэта, членам-карэспандэнтам АН БССР Л. А. Шаматковым. Леанід Аляксандравіч расказаў прысутным аб рабоце кангрэса, аб тых праблемах, над якімі працуюць цяпер вучоныя-матэматыкі свету і, у прыватнасці, алгебраісты. Ён адказаў таксама на пытанні студэнтаў.

**М. СЕЛЬКІН,**
**в. а. дэкана матэматычнага факультэта.**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**28-га снежня ў актавай зале адбудзецца агульнауніверсітэцкі партыйны сход. На парадак дня вынесена пытанне «Аб партыйным кіраўніцтве грамадскімі арганізацыямі універсітэта». Дакладчык — намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце І. В. НЯМКЕВІЧ.**

**Пачатак сходу — у 14 гадзін.**

**ПАРТКОМ.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра матэматычнага аналізу горача віншуюць старшага выкладчыка гэтай кафедры ГАЎРЫЛЮКА Аляксандра Уладзіміравіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**

